Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛІСТАПАДА 2021 г. АЎТОРАК № 221 (29590)



ЦІ СУМЯШЧАЕЦЦА АЛКАГОЛЬ З ЛЕКАМІ?

8

СПАДЧЫНА У ЛІЧБЕ

13



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Тамара ЛЯВОНЧЫК, старшыня пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Савета Рэспублікі:**

*«Мы адныя з першых трапілі ў стыхійны лагер бежанцаў на беларуска-польскай граніцы. Маштаб таго, што адбываецца, разумееш толькі там. Гэта бясконцыя вогнішчы, з'едлівы дым, але найбольшае ўражанне робіць вялікая колькасць дзяцей і жанчын. За два дні мы выдалі 7,5 т вады і харчавання. Думаю, усім, можа, і не хапіла. Бежанцы — людзі камунікабельныя і ідуць на дыялог, калі бачаць, што ім жадаюць дапамагчы. Праблем падчас паездкі ў зносінах з імі не ўзнікала».*

## КОРАТКА

- **Нацбанк працягнуў час работы кас для абмену банкнот узору 2000 года.**
- «Зоркі сёмага неба» адкрыюць кінафестываль «Лістападзік» у Мінску.
- **Аўтапрабег «Дарога памяці» пройдзе па маршруце Брэст — Мінск — Віцебск — Смаленск.**
- Ірак 18 лістапада плануе першы вывазны рэйс для сваіх грамадзян з Беларусі.
- **Перадпавагоднія кірмашы ў Брэсце стартуюць 1 снежня.**
- Міністр аховы здароўя РФ Міхаіл Мурашка: камбінацыя вакцын ад каранавіруса «Спадарожнік V» і ад грыпу пры адначасовым увядзенні можа ўзмацняць іх эфект.
- **Беларусь за 9 месяцаў экспартавала 90 тысяч тон бульбы.**
- Ашуканец выманіў у пенсіянеркі з Ваўкавыска каля 54 тысяч долараў.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Палітычныя навацыі павінны ў канчатковым выніку стварыць умовы для развіцця суверэннай Беларусі»

## У Палацы Незалежнасці прайшла чарговая сустрэча з працоўнай групай па дапрацоўцы праекта Канстытуцыі

**За няпоўны месяц гэта ўжо трэцяя сустрэча Прэзідэнта Беларусі з вузкім колам распрацоўшчыкаў будучага Асноўнага Закона. Гэты склад спецыялістаў займаўся прававым увасабленнем пытанняў, па якіх не прыйшла да адзінага меркавання Канстытуцыйная камісія. На мінулай сустрэчы з рабочай групай, 4 лістапада, Аляксандр Лукашэнка пералічыў этапы, якія засталіся ў рабоце над Канстытуцыяй. Учарашняе пасяджэнне з рабочай групай — першы з іх. Затым канчатковы варыянт закона разгледзіць Канстытуцыйная камісія, пасля яго апублікуюць для народнага абмеркавання і, нарэшце, вынесуць на рэферэндум.**



Фота БелТА.

### УМОВЫ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ І ДАБРАБЫТУ

На пачатку абмеркавання кіраўнік краіны нагадаў, што на сустрэчы з рабочай групай па дапрацоўцы праекта Канстытуцыі належыць падвесці вынікі яе работы напярэдадні нарады з Канстытуцыйнай камісіяй.

Па словах Прэзідэнта, мэта ўчарашняга мерапрыемства — звесці разам усе выпрацаваныя прапановы, стварыць канчатковую канфігурацыю абноўленага Асноўнага Закона, зрабіць гэта так, каб яго палажэнні ўяўлялі сабой адзіную стройную сістэму.

СТАР. 2

# Самы страшны холад



Фота БелТА.

*Бежанцы, якія ўжо тыдзень знаходзіліся на беларуска-польскай граніцы з надзеяй на тое, што нарэшце змогуць трапіць у Еўрасаюз, учора пакінулі свой лагер і рушылі да прапускнога пункта. Яны проста стаміліся чакаць і змерзлі: большасць гэтых людзей — выхадцы з цёплых краін, не прывычныя нават да нізкай плюсавой тэмпературы. Протрымацца ў лагеры столькі халодных дзён і начэй ім дапамагла гуманітарная падтрымка беларускага боку: людзей кармілі, аказвалі медыцынскую дапамогу, абагравалі. Але ці доўга вытрымае ў такім няпэўным становішчы жанчына, чыё дзіця не можа заснуць у халоднай палатцы пад гукі сірэн і святло пражэктараў з польскага боку? Ці доўга вытрымае мужчына, чыя цяжарная жонка беспаспяхова спрабуе сагрэцца каля вогнішча?.. І яны пайшлі да пункта пропуску з надзеяй на міласэрнасць, на чалавечнасць, на здаровы сэнс, у рэшце рэшт. Яны называюць свой шлях дарогай у адзін канец і адмаўляюцца пакідаць месца, да якога ім удалося дабрацца і ад якога так недалёка да мэты... Вяртацца многім з іх проста няма куды — у іх зруйнаваных краінах не засталося ні дома, ні працы, ні ўпэўненасці ў бяспецы...*

*На пункце пропуску з польскага боку гэтых няшчасных сустрэлі... Вёрталётамі, узброенымі людзьмі, вадамётам. Але людзі не сышлі, а проста пачалі разбіваць лагер там жа, на месцы. Калі пісаліся гэтыя радкі, на двары ўжо была мінусавая тэмпература. Надыходзіла доўгая і халодная лістападаўская ноч, а людзі заставаліся там. Вы атрымаеце гэту газету назаўтра, і мы не можам сказаць, як перажылі ноч дзеці на фота, сотні іншых дзяцей, якія засыналі пад ветрам на халодным бетоне пад раўнадушнымі позіркамі да зубоў узброеных польскіх салдат.*

*Самы страшны холад — не на вуліцы. Ён у чалавечых словах і ўчынках...*

# «Палітычныя навацыі павінны ў канчатковым выніку ствараць умовы для развіцця суверэннай Беларусі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Пры гэтым трэба памятаць, што ***любыя палітычныя навацыі павінны ў канчатковым выніку ствараць умовы для развіцця суверэннай Беларусі і дабрабыту нашых людзей***», — сказаў Прэзідэнт.

Усе прапановы па ключавых пытаннях, дадаў кіраўнік краіны, давядзецца данесці да членаў Канстытуцыйнай камісіі, а падрыхтавацца да гэтага мерапрыемства трэба будзе дасканала.

«Думаю, што трэба таксама правесці маштабнае сацыялагічнае даследаванне на гэтую тэму, ахапіўшы розныя рэгіёны і пласты насельніцтва. Як мы рабілі напярэдадні Усебеларускага народнага сходу. ***Хацелася б, каб людзі выказаліся. Нам важнае іх меркаванне не толькі па тэме канстытуцыйнай рэформы, але і па іншых актуальных пытаннях, што датычацца развіцця нашай краіны і нашай будучыні***», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што канстытуцыйная рэформа — адзін з момантаў, які апазіцыя з-за мяжы спрабуе выкарыстаць для дэстабілізацыі краіны.

«Павінен сказаць: не атрымаецца. На гэты раз. У іх нічога ўвогуле не атрымаецца», — дадаў ён.

### «МЫ НЕ ХОЧАМ НІЯКАГА КАНФЛІКТУ НА ГРАНІЦЫ»

Прэзідэнт сцвярджае, што праблем сёння ў краіне дастаткова, але асабліва хвалюе яго сітуацыя на мяжы.

«Я, калі кажу аб праблемах, маю на ўвазе нейкія рухі на дзяржаўнай граніцы — на захадзе, з НАТА, Еўрапейскім саюзам. Там дастаткова гэтых праблем, асабліва фэйкі», — заявіў Прэзідэнт і падкрэсліў, што яго Адміністрацыя павінна больш эфектыўна рэагаваць на падзеі. У першую чаргу гэта неабходна, каб насельніцтва разумела, што адбываецца на граніцы.

«Я ўжо гляджу, нас абвінавачваюць, што мы блакіруем гуманітарную дапамогу і не даём яе тым бедным людзям, бежанцам, якія сканцэнтраваны на дзяржаўнай граніцы. Асабліва гэта робяць палякі. Гэта больш чым дзіўна выглядае», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Ён адзначыў, што ўсе выхадныя займаўся гэтымі пытаннямі і яго даручэнні выкананы. «Мы і дзетак кормім, і цяжарных жанчын кормім, і дровы падвозім — усё, што ім неабходна. Больш за тое, мы ўсё робім для таго, каб гэтым лагер не існаваў, каб усе ахвотныя трапілі ў Еўрасаюз. Тых, хто не жадае, мы гатовы, як гэта звычайна рабілі, пасадзіць у самалёты (у тым ліку і «Белавія»), якія адвязуць іх дадому», — заявіў Прэзідэнт.

Па яго словах, ніхто з мігрантаў не хоча вяртацца: ніхто ўжо не мае ў роднай краіне жылля, сродкаў для існавання, а некаторыя баяцца за сваё жыццё. Аляксандр Лукашэнка звяртае ўвагу, што ідзе актыўная работа над тым, каб угаварыць мігрантаў вярнуцца на Радзіму.

«Гаворачы аб прапанове ўлад германскага Мюнхена, прыняць у сябе гэтых бежанцаў, Прэзідэнт заўважыў: «Малайцы, мюнхенцы. Праблема таго не вартая — 2-3 тысячы няшчасных збеглых людзей яны не могуць прыняць?! Могуць, канешне, што за праблема? Калі палякі не даюць гуманітарнага калідора, перашкаджаюць гэтаму, дык мы можам авіякампаніяй«Белавія» вывезці іх у Мюнхен».

Прэзідэнт сцвярджае, што Польшчы сёння неабходны канфлікт для адцягнення ўвагі ад унутраных праблем і нявырашаных пытанняў з Еўрапейскім саюзам.

«Пачынаецца мітусня і стральба на дзяржаўнай граніцы. Яшчэ раз падкрэслю: мы не хочам ніякага канфлікту на нашай дзяржаўнай граніцы. Гэта нам на шкоду. Нам не трэба, каб гэтыя бедныя людзі хадзілі па Мінску, Гродне, напружваючы нашых людзей, асабліва на дзяржгранiцы, дзе пагранічнікі сёння нясуць ва ўзмоцненым рэжыме сваю службу», — сказаў кіраўнік краіны.

На яго думку, сітуацыя на граніцы напружваецца спецыяльна і з пэўным прыцэлам. «Праз коску: Лукашэнка вінаваты — наступны Пуцін. Беларусь вінавата, следам — Расія вінавата. Зразумела, што гэта накіравана на эскалацыю напружанасці. Паглядзіце, што ў Чорным моры робіцца. Вось мы з Прэзідэнтам Расіі ўчора размаўлялі доўга па гэтым пытанні. Мярзотна вядуць сябе амерыканцы і натаўцы ў Чорным моры», — абурыўся Прэзідэнт.

Прэзідэнт абверг заявы, што ўсе зацікаўленыя ў вырашэнні міграцкага крызісу «вымушаны гуляць па правілах Лукашэнкі». Ён адказвае: не гуляйце, зрабіце наадварот.

«А наадварот у іх так: трэба забраць гэтых мігрантаў, і мы выб'ем з рук Лукашэнкі козыр. Дык выбіце яго, забярыце гэтых мігрантаў — і ў Лукашэнкі ніякіх козыраў не будзе», — заўважыў кіраўнік краіны, адзначыўшы: тое, што зараз твораць еўрапейцы, ім адгукнецца вясною.

Беларусь, у сваю чаргу, падкрэслівае Аляксандр Лукашэнка, ніколі наўмысна не арганізоўвала міграцыйны паток праз свае граніцы.

«Беларусі гэта сабе даражэй. ***Мы ніколі гэтым не займаліся і займацца не маем намеру. Санкцыямі пужаюць — добра. Паглядзім. Яны думаюць, я буду жартаваць. Нічога падобнага. Мы будзем абараняцца. Далей нам адступаць няма куды***», — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

*Яшчэ адна тэма, якую не пакідае па-за рамкамі нарад Прэзідэнт, — сельская гаспадарка. Аляксандр Лукашэнка сцвярджае, што з забеспячэннем харчаваннем насельніцтва, заканчэннем уборачнай усё нармальна.*

*«Тэмпы добрыя. Трэба кантраляваць усё», — адзначыў кіраўнік краіны.*

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта**, паведаміў, што дапрацоўка Канстытуцыі завяршаецца, застаецца ўнесці асобныя штрыхі ў фармулёўкі з улікам сённяшняй нарады.

«Потым будзе яшчэ адна нарада вялікага фармату з удзелам членаў Канстытуцыйнай камісіі, таму што асноўная работа па фарміраванні праекта Канстытуцыі была выканана яе членамі. Сёння вывучэнне і даклады ішлі па артыкулах, па тых пытаннях, што выклікалі сумненні ў дакладнасці фармулёвак», — расказаў Ігар Сергеенка.

Адно з пытанняў, якое ўвесь час выклікала рознагалоссі, — статус Усебеларускага народнага сходу. Як падкрэсліў суразмоўца, вызначаны паўнамоцтвы гэтага органа і працэс фарміравання дэлегатаў.

На ўсенароднае абмеркаванне праект Канстытуцыі будзе вынесены ў канцы лістапада — пачатку снежня. «Кожны зможа паглядзець яе і ўнесці свае прапановы, якія будуць улічаны і на гэтым этапе», — дадае Ігар Сергеенка.

Ён падкрэсліў, што навацыі ў заканадаўстве не павінны дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне і прывесці да разбалансаванасці сістэмы дзяржаўных улад.

«Навацыі павінны толькі садзейнічаць узмацненню дзяржаўнасці і абароне канстытуцыйнага строю, суверэнітэту краіны. Зразумела, што гэтыя пытанні ў агульным выглядзе канкрэтызаваны, дапоўнены будуць у новым праекце Канстытуцыі», — рэзюмаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў**, падкрэсліў, што дзеючая Канстытуцыя патрабуе дапаўненняў. «Мы рухаемся ў часе і бачым, што сёння неабходна змяняць пэўныя падыходы, выбудоўваць стратэгічныя кірункі, мэты, каб далей заканадавец мог арыентавацца на гэтыя кірункі», — дадаў ён.

Па яго словах, працуючы над праектам Асноўнага Закона, распрацоўшчыкі шукалі баланс інтарэсаў розных колаў грамадства.

«Тут важна не нанесці шкоду, не змяніць тое, што сёння працуе, а мадэрнізаваць для далейшага развіцця. І тут вельмі тонкія рэчы, якія абмяркоўваліся неаднаразова, па іх пыталіся меркавання працоўных калектываў, спецыялістаў, юрыстаў, звярталіся да міжнароднай практыкі. У сукупнасці, на мой погляд, атрымаўся вельмі добры варыянт, праект», — сказаў Міхаіл Орда.

Блізкая ўлада

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — АХОВА ЗДАРОЎЯ І ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ МЯСЦОВЫХ ДАРОГ

## Уладзімір Андрэйчанка наведаў з рабочай паездкай Ушацкі раён

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА здзейсніў рабочую паездку ва Ушацкі раён Віцебскай вобласці. Тут ён правёў чарговы асабісты прыём грамадзян, а таксама наведаў фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Юнацтва-Ушачы» і Ушацкую раённую цэнтральную бальніцу.**

На асабісты прыём да спікера Палаты прадстаўнікоў, які праходзіў ва Ушацкім раённым выканаўчым камітэце, звярнуўся пенсіянер з вёскі Звонь. Іван Ягоравіч Карабань расказаў, што за вырубку дрэў на дровы мясцовы суд пакараў яго штрафам, а гэта 45 базавых велічынь. Пенсіянера такое рашэнне не задавальняе. Уладзімір Андрэйчанка адказаў заяўніку, што падрабязна пазнаёміўся з матэрыяламі справы і не бачыць падстаў адмяняць рашэнне суда.

— Усё зроблена абгрунтавана і справядліва. Ёсць закон «Аб раслінным свеце». Згодна з ім, вы павінны былі атрымаць дазвол на вырубку дрэў. Такі дазвол даюць мясцовыя органы ўлады — уласнік зямель. Калі вы не згодны з рашэннем раённага суда, трэба было яго абскардзіць, вы гэтага на працягу года не зрабілі. Вас пакаралі не за кусты, як вы кажаце, а за парушэнне закона «Аб раслінным свеце».

Наступны заяўнік, Мікалай Леднік, старэйшына вёскі Ваўчо, прыйшоў з прыемнай нагоды — падзякаваць Уладзіміру Андрэйчанку, які з'яўляецца дэпутатам ад Докшыцкай выбарчай акругі, куды ўваходзіць Ушацкі раён, за арганізацыю водазабеспячэння ў сельскай мясцовасці.

— Я трэці раз у вас на прыёме і хачу падзякаваць за тую работу, якая зроблена. Нам правялі ваду — вялікі дзякуй за ваш клопат, — сказаў Мікалай Леднік. Трэба адзначыць, што работы былі праведзены вельмі аператыўна, і 90 % жыхароў вёскі пажадалі падключыцца да водазабеспячэння.

З пытаннямі вырубкі кустоўя звярнуўся і яшчэ адзін пенсіянер, жыхар вёскі Шчарбёнкі. Ён паскардзіўся, што кустоўе расце побач з вясковай дарогай (на невялікім участку ад вёскі Арэхаўна да Шчарбёнак), з-за чаго зімой па ёй праехаць праблематычна. Высветлілася, што заяўнік ужо звяртаўся ў мясцовыя органы ўлады, і ДРБУ ўсе небяспечныя ўчасткі ўжо высекла. Там, дзе кустоўе засталося ў кюветах і паласе адводу, яно будзе высечана ў найбліжэйшы час.

Як адзначыў Уладзімір Андрэйчанка, ёсць рашэнне Прэзідэнта па 7 тысячах кіламетраў мясцовых дарог, якія павінны быць адрамантаваны ў найбліжэйшую пяцігодку. І пацікавіўся ў мясцовых улад, як выконваецца гэта даручэнне. Старшыня Ушацкага райвыканкама Уладзімір Аўдошка расказаў, на якіх участках сельскіх дарог у раёне за апошнія месяцы зроблены рамонт. І папрасіў садзейнічання ў рамонце ўчастка дарогі да сядзібы Васіля Быкава, якую часта наведваюць турысты. Уладзімір Андрэйчанка паабяцаў дапамагчы вырашыць гэта пытанне.

— Кантактаваць з насельніцтвам вельмі важна. Але важна і іншае: за апошні час вельмі многае зроблена па розных кірунках дзякуючы сістэмнай рабоце, якая праведзена ў Беларусі. І, напэўна, у сувязі з гэтым колькасць зваротаў зменшаецца, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка ў размове з журналістамі. — Раней масава людзі прыходзілі на прыём па капітальным рамонце жылля, сістэм ацяплення. Цяпер гэтыя пытанні зняты, бо шмат зроблена па капітальным рамонце, устаноўлены нарматывы па колькасці рамонтаў у год, і я мяркую, гэта дае вынікі. Былі і пытанні з забеспячэннем пітной вадой. Сёння ў краіне рэалізоўваецца праграма «Чыстая вада» — у выніку таксама зваротаў стала менш. Цяпер ёсць пытанні па мясцовых дарогах. Дзякуючы таму рашэнню, якое прыняў Прэзідэнт краіны на пяцігодку — а гэта 7 тысяч мясцовых дарог, якія трэба адрамантаваць, — ужо сёлета 1,5 тысячы кіламетраў зроблена, гэтыя пытанні вырашаюцца. Крытычных пытанняў на сёння я не бачу.

Ва Ушацкай раённай бальніцы Уладзімір Андрэйчанка пракантраляваў ход рамонтных работ, а таксама наведаў хірургічнае і тэрапеўтычнае аддзяленні. Галоўны ўрач Анжаліка Міранкова ад калектыву бальніцы падзякавала Старшыні Палаты прадстаўнікоў за ўвагу да аховы здароўя і дапамогу ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Яна расказала, што выдзеленыя ў апошні год сродкі накіроўваліся на дааснашчэнне мясцовай лабараторыі і рэанімацыйнага аддзялення, што надзвычай важна ва ўмовах цяперашняй эпідэмічнай сітуацыі. Закуплены апараты ШВЛ, шэсць інфузаматаў для цітравання лекавых сродкаў, кіслародны канцэнтратар, лабараторнае абсталяванне для біяхімічных даследаванняў, электракардыёграф, дыфібрылятар.

Цяпер у бальніцы вядзецца капітальны рамонт з элементамі мадэрнізацыі. Але рамонту яшчэ патрабуе прыёмнае аддзяленне, таксама мусіць быць добраўпарадкавана тэрыторыя.

— Зрабіце дастойна, каб тэрыторыя выглядала сучасна, заасфальтуйце яе, пракладзіце дарожкі, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. У цэлым Старшыня Палаты прадстаўнікоў застаўся задаволены работай мясцовай бальніцы, падкрэсліўшы, што на асабістых прыёмах заяўнікі пакідаюць пра яе добрыя водгукі.

Наведаў спікер Палаты прадстаўнікоў і фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Юнацтва-Ушачы». Начальнік аддзела спорту і турызму Ушацкага райвыканкама Сяргей Ціханёнак распавёў, што, згодна з праграмай «Алімпійскі талент», па адборы таленавітай моладзі было праведзена тэсціраванне ў 9 раёнах Віцебскай вобласці, падчас якога адабраны адораныя дзеці. Але іх трэба дарасціць да вучылішчаў алімпійскага рэзерву, а для гэтага сабраць разам. Гэта было б магчыма на базе комплексу «Юнацтва-Ушачы», калі б тут быў інтэрнат. Таксама дапрацоўкі патрабуе і Кодэкс аб адукацыі, каб у спартыўных класах стала магчымым навучанне з кругласутачным знаходжаннем. Уладзімір Андрэйчанка даручыў падрыхтаваць прапановы ў Кодэкс аб адукацыі і не пярэчыў будаўніцтву інтэрната ў раённым цэнтры.

**Алена КРАВЕЦ**

*г. п. Ушачы.*

У цэнтры ўвагі

# ГУМАНІЗМ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА ДАПАМАГАЕ БЕЖАНЦАМ ВЫЖЫЦЬ

## У выхадныя каардынацыя дзейнасці гуманітарнай місіі ў стыхійным лагеры на беларуска-польскай граніцы не спынялася

**Сенатары трымалі сітуацыю на асаблівым кантролі: падвоз харчавання, яго размеркаванне сярод бежанцаў, арганізацыйныя пытанні жыцця стыхійнага лагера і аказанне медыцынскай дапамогі тым, хто меў патрэбу.**

Трэба сказаць, што паміж прадстаўнікамі гуманітарнай місіі і бежанцамі было поўнае паразуменне. Па выніку арганізацыйнага сходу прадстаўнікоў гуманітарнай місіі з бежанцамі быў вызначаны ўпаўнаважаны з іх боку для аператыўнага інфармавання аб неабходнасці аказання ім дапамогі, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Нагадаем, што каардынацыя дзейнасці гуманітарнай місіі для бежанцаў даручана Прэзідэнтам **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ**, на месцы кантроль за сітуацыяй ажыццяўляе **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ**.

Ён адзначыў, што беларускі бок аказвае ўсебаковую дапамогу, суперажывае разам з бежанцамі і жадае, каб усё ў гэтых людзей вырашылася станоўча.

— Беларускі народ дапамагае тым, хто мае патрэбу ў гэтай дапамозе, і я перакананы, што людзі будуць удзячныя за тое, што мы для іх робім, — кажа ён.

### ДАПАМОГА БЕЖАНЦАМ У ЛІЧБАХ

Па выніку пяці дзён была аказана гуманітарная дапамога прадуктамі харчавання ў аб'ёме 18,6 тоны, у тым ліку:

- малако — 5 тон;
- хлебабулачныя вырабы — 5,5 тоны;
- кансервы мясныя — 2 тоны;
- кансервы з гародніны — 0,8 тоны;
- каўбасныя вырабы — 2 тоны;
- кандытарскія вырабы — 1,3 тоны;
- садавіна — 0,8 тоны;
- дзіцячае харчаванне — 1,2 тоны.
- Вада пітная — 7 тон.
- Цёплае адзенне — 3200 адзінак.
- Коўдры — 760 адзінак.



Фота БелТА.

У прыватнасці, у суботу, 13 лістапада, былі падвезены дровы і арганізавана іх распілоўванне, усталяваны тры палаткі, дзе можна было абагрэцца і падсілкавацца дзецям і жанчынам. Была падрыхтавана палатка для размяшчэння медыка, каб бежанцы ведалі, да каго можна звярнуцца з хваробай.

Як медык, старшыня камісіі нагадаў, што нельга забывацца і аб каранавірусе.

— Будзем нагадваць бежанцам аб нашэнні масак, каб не дапусціць распаўсюджвання вірcallснай інфекцыі, — кажа сенатар.

Акрамя таго, ён расказаў, што беларускі бок можа размясціць каля 400 бежанцаў у беларускіх санаторыях, але ахвотных пакуль няма.

У нядзелю, 14 лістапада, была арганізавана дастаўка гуманітарнага грузу з Мінска і Мінскай вобласці — ад прафсаюзаў і Беларускага саюза жанчын.

— Кожны, хто гатовы і можа аказаць дапамогу, нясуць у пункты збору вопратку, пералічваюць грошы. У любым раённым цэнтры гэта можна зрабіць у аддзяленні Чырвонага Крыжа. Думаю, той гуманізм, якім валодае беларускі народ, дапамагае бежанцам выжыць, захаваць спакой і адчуваць сябе абароненымі з боку беларускай дзяржавы, — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

Ён нагадаў, што за гэтыя дні, пакуль бежанцы знаходзяцца на лініі беларуска-польскай граніцы, было размеркавана больш за 30 тон гуманітарнага грузу.

— Гэта спагадлівыя людзі, дзеці добрыя, з усмешкамі, не губляюць аптымізму, — ацаніў настрой у лагеры сенатар і выказаў спадзяванне, што канфлікт на граніцы хутка вырашыцца, і кожны з тых, хто хоча перасекчы граніцу, рэалізуе свае планы і знойдзе сабе краіну для жыцця, якую ён абраў.

У нядзелю ў лагер бежанцаў прыехаў **сенатар Дзмітрый БАСКАЎ**. Ён пракантраляваў работу гуманітарнай місіі і адзначыў, што бежанцы забяспечаны неабходнай гуманітарнай і медыцынскай дапамогай:

— Бачу, што бежанцы ўсім забяспечаныя. У іх ёсць ежа і вада. На маіх вачах ужо два разы прывозілі дровы. Гэта дапамагае перажыць халодныя ночы, — расказаў ён. — Эмоцыі моцныя. Асабліва шкада дзяцей, якія апынуліся ў такіх умовах. Але гэтыя людзі нікуды з'язджаць не хочуць. Прэзідэнт прапанаваў рассяліць бежанцаў у найбліжэйшых санаторыях, і для гэтага ўсё было ўжо падрыхтавана, але тыя адмовіліся. Да апошняга чакаюць калідор, каб прайсці граніцу.

А пакуль людзі знаходзяцца ў гэтым чаканні, пацыху арганізоўваюць свой няхітры побыт: падтрымліваюць чысціню, балазе ім у гэтым дапамагаюць: на выхадных прывезлі кантэйнеры для збору смецця і біяпрыбіральні.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

МЕРКАВАННЕ

*Ігар ГЕДЗІЧ:*

### «Сцяну абыякавасці з польскага боку не здольны прабіць плач дзяцей»

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці, дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра:**

— Гаворачы пра падзеі на беларуска-польскай граніцы, важна згадаць прэамбулу. Той, хто прыйшоў са сваімі псеўдадэмакратычнымі намерамі ў краіны бежанцаў, у прыватнасці Ірак, Сірыю, і пачаў там насаджаць свае правілы, казаць пра тое, што насельніцтва гэтых краін жыве няправільна, па сутнасці, прынёс факел да іх у дамы. Спалілі. Разбурылі. Загубілі чалавечыя жыцці. І ў той жа час сказалі: «Прыходзьце да нас, мы будзем вам рады», — нагадвае сенатар.

Ён звяртае ўвагу, што палітычныя эліты заходніх краін прыклалі шмат намаганняў для таго, каб стварыць гэты міграцыйны крызіс.

— Ён самаробны і створаны рукамі членаў краін НАТА, сатэлітаў амерыканскай палітыкі, якія навязваюць меркаванні, адрозныя ад перакананняў і поглядаў людзей, якія жылі ў тых краінах, — кажа Ігар Гедзіч.

Што датычыцца польскага боку, сенатар вінаваціць яго ў выкарыстанні тэм бежанцаў на сваю карысць:

— Ён вельмі моцна цісне на педалі ў імкненні зарабіць пэўныя палітычныя балы ў сваіх заступнікаў, суверэнаў. Польскі істэблішмент спрабуе граць на дудцы, вось толькі выходзіць фальшыва, бо ў яго няма ні музычнага слыху, ні палітычнага нюху, — перакананы суразмоўнік.

Ён нагадвае, што ў самой Польшчы не ўсё спакойна.

— Становішча кансерватыўнай палітычнай партыі «Права і справядлівасць» хісткае. Польскае кіраўніцтва разумее, што жыхароў краіны трэба адцягваць ад унутранай праблемы. І якім чынам гэта лепш рабіць? Відавочна, пераключыўшы ўвагу на гісторыю з бежанцамі на беларуска-польскай граніцы. Яны самі стварылі праблему і цяпер больш за ўсіх крычаць, — перакананы Ігар Гедзіч.

Паводле яго слоў, гвалтоўнае выцясненне польскімі сілавікамі людзей на лінію граніцы, сярод якіх нямала жанчын, дзяцей і старых, стрэлы, выкарыстанне газу — усе гэтыя дзеянні ніяк не карэлююцца з той хвалёнай ветлівасцю, з якой еўрапейскія чыноўнікі абяцалі сустракаць мігрантаў.

— Сцяну абыякавасці і неразумення з таго боку не здольныя прабіць ні плач дзяцей, ні маленні жанчын аб дапамозе, — акцэнтуе ўвагу сенатар.

Ён робіць высновы, што занепакоенасць лёсамі ўсіх гэтых людзей, якія літаральна жывуць пад адкрытым небам, замярзаюць па начах, аказалася напускной, а абяцаная абарона правоў чалавека — пустым выхлапам.

— Усё, што мы бачым, — бесчалавечнае стаўленне да тых, хто, ратуючыся ад вайны, ідзе насустрач мірнаму, без слёз і крыві жыццю. Вось толькі шлях да яго абгароджаны калючым дротам!

Сітуацыя на граніцы

# КАЛІ ЖЫЦЦЁ ПАД ПАГРОЗАЙ...

## Як беларускія медыкі прыходзяць на дапамогу бежанцам



Фота grodnonews.

**Людзі, якія трапілі ў пагранічную пастку, здаецца, гатовы вытрымаць многае, каб дабіцца сваёй мэты і трапіць у Еўрасаюз. Але цяжкія ўмовы, хваляванні апошніх дзён не маглі не адбіцца на іх здароўі. Гродзенскія ўрачы неаднойчы прымалі такіх пацыентаў.**

У іх ліку апынулася і 27-гадовая бежанка з Ірака. Пацыентка з граніцы паступіла ў Гродзенскі абласны перынатальны цэнтр у даволі складаным стане. Беларускія пагранічнікі знайшлі яе каля пункта пропуску Бераставіца, адтуль даставілі ў раённую бальніцу, дзе паставілі дыягназ — унутрывантробная гібель плода. Паколькі выпадак лічыцца цяжкім, жанчыну перавезлі ў Гродна. Як паведамілі ў Гродзенскім перынатальным цэнтры, дзіця было данощаным, але нарадзілася нежывым.

У нейкі момант жанчына перастала адчуваць, што яно рухаецца, а потым наогул пачала страчваць прытомнасць. Дзякуючы таму, што яе своечасова даставілі ў медыцынскую ўстанову, яна выжыла, але згубіла дзіця.

Як пазней стала вядома, на граніцы ў яе заставаліся муж, бацькі і трое іншых дзяцей. Пацыентка прасіла даведацца, дзе яны зараз знаходзяцца, каб вярнуцца да іх. Пры выпісцы супрацоўнікі перынатальнага цэнтра забяспечылі жанчыну цёплай вопраткай.

Пасля лячэння з абласной дзіцячай клінічнай бальніцы выпісана 12-гадовая дзяўчынка, якую таксама даставілі з граніцы. Яна паступіла са скаргамі на боль у жываце. Яе суправаджала 20-гадовая сястра. Напачатку былі падазрэнні на апендыцыт, таму яе накіравалі ў хірургічнае аддзяленне. Але праведзены пашыраны комплекс дыягностыкі не выявіў захворвання, пры якім патрэбна спецыялізаваная медыцынская дапамога. Проста дзяўчынка не вытрымала тых умоў, у якіх вымушана была знаходзіцца. Магчыма, яна проста была знясіленая, галодная. Таму акрамя правядзення дыягностыкі абедзвюх сясцёр накармілі і абагрэлі. І хоць старэйшая сястра не магла па ўзросце быць пацыентам бальніцы, іх вырашылі не разлучаць і дазволілі ёй застацца. Пасля некалькіх дзён бежанак выпісалі.

У складаным становішчы апынуўся яшчэ адзін пацыент з беларуска-польскай граніцы. На гэты раз за дапамогай звярнуўся бацька васьмігадовага хлопчыка-інваліда. Яго сыну пасля аўтамабільнай аварыі ампутавалі абедзве нагі да калена, хлопчык ходзіць на пратэзах. Але апошнім часам у яго ўзніклі цяжкасці пры хадзьбе. Гэта прымусіла бацьку звярнуцца па дапамогу да беларускіх урачоў. У лагер бежанцаў была выклікана спецыялізаваная брыгада на чале з **дырэктарам Гродзенскага філіяла Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўляльнага цэнтра Валерыем ВІТКОЎСКІМ**.

— Калі мы прыехалі на месца, стала відавочна, што патрэбна больш дасканала разабрацца ў сітуацыі, і прапанавалі паехаць у нашу майстэрню. Бацька пагадзіўся. Пры дэталёвым абследаванні было ўстаноўлена, што зламаўся каленны вузел. Магчыма, хлопчык упаў альбо доўга хадзіў па няроўнай паверхні. Такім чынам, каленны модуль значна знасіўся, — расказаў Валерый Віткоўскі.

Праз перакладчыка бежанцы расказалі, што кожныя восем месяцаў павінны мяняць пратэзы, бо хлопчык расце. Але калі гэта зноў адбудзецца — невядома. Хлопчыку цяжка хадзіць яшчэ і з-за пашкоджання існуючага пратэза. У майстэрні пратэз аднавілі — замянілі зламаны вузел, падрэгулявалі тое, што было патрэбна. Пацыент і яго бацька засталіся задаволеныя дапамогай медыкаў.

Як адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства Аляксей ШЧАРБІНСКІ**, галоўнае медыцынскае ведамства краіны гарантуе своечасовае аказанне дапамогі ўсім грамадзянам, якія апынуліся ў складанай сітуацыі. «Мінздраў гарантуе аказанне дапамогі — незалежна ад нацыянальнасці, прыналежнасці да рэлігійнай канфесіі, полу і ўзросту», — паведамляе тэлеграм-канал «Афіцыйны Мінздраў».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Кантэкст

# ВЕРТАЛЁТ, ВАДАМЁТ І КАЛЮЧЫ ДРОТ

## Польскі бок аб'явіў вайну бежанцам

**Тыдзень праіснаваў стыхійны лагер бежанцаў на граніцы з Польшчай недалёка ад пункта пропуску «Брузгі». Учора ён нечакана прыйшоў у рух. «Бежанцы, спадзеючыся на станоўчы зыход сітуацыі, сабралі цёплыя рэчы, палаткі, спальныя мяшкі. Ужо да поўдня яны самаарганізаваліся ў вялікую калону і рушылі ў напрамку пункта пропуску «Брузгі». Бежанцы падкрэсліваюць свае выключна мірныя намеры і гатовы да развіцця любой сітуацыі. На чале калоны — жанчыны з маленькімі дзецьмі», — адзначыў афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.**

«Мы стаміліся чакаць, мы змерзлі», — заўважыў карэспандэнту БелТА адзін з мужчын у калоне. «Мы ідзём у Германію. Мы адкрыем граніцу!» — адзначыў іншы. Чаканні не спраўдзіліся. Польскі бок выставіў загароду з калючага дроту. За ім — узброеныя людзі, вадамёты, у небе — баявы верталёт, гучнагаварыцелі абвяшчаюць прымяненне сілы ў выпадку спробы пераходу граніцы. «Паглядзіце, дэмакратыі там няма!» — эмацыянальна выказаўся журналістам яшчэ адзін бежанец.

Раней міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей і намеснік старшыні Еўрапейскай камісіі, высокі прадстаўнік Еўрапейскага саюза па замежных справах і палітыцы бяспекі Жазэп Барэль правялі тэлефонную размову, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. «З беларускага боку пацверджана прынцыповая гатоўнасць да раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялогу з Еўрасаюзам. Падкрэслена бесперспектыўнасць санкцый і контрпрадукцыйнасць санкцыйных падыходаў для развіцця адносін па лініі Беларусь — ЕС», — адзначаецца ў паведамленні. Бакамі была абмеркавана складаная міграцыйная сітуацыя на граніцы Беларусі і ЕС. Уладзімір Макей даведаў да суразмоўніка інфармацыю аб прынятых Беларуссю захадах па скарачэнні патоку мігрантаў з краін Азіі, Афрыкі і Блізкага Усходу, аказанні гуманітарнай дапамогі бежанцам на граніцы, узаемадзеянні па гэтым пытанні з міжнароднымі арганізацыямі сістэмы ААН. Пацверджана зацікаўленасць у больш хуткім урэгуляванні міграцыйнага крызісу. Бакі дамовіліся падтрымліваць адкрытымі каналы для дыялогу.

Улады Польшчы, Літвы і Латвіі ў сувязі з міграцыйным крызісам патрабуюць ад ЕС фінансавання будаўніцтва сцяны на граніцы з Беларуссю. «Цяпер у Еўропе больш сцен, чым у эпоху Берлінскай сцяны. Але праблемы мігрантаў не будуць вырашаны з іх дапамогай», — заўважыў Жазэп Барэль у інтэрв'ю тэлеканалу France24. Ён таксама адзначыў, што неабходна «займацца каранямі міграцыйнай праблемы, а не рабіць Еўропу крэпасцю». «Мы не вырашым нашых праблем са знешнім светам, узводзячы новую вялікую Кітайскую сцяну вакол Еўропы», — працытавала кіраўніка еўрапейскай дыпламатыі ТАСС.

Колькасць бежанцаў на беларуска-польскай граніцы непараўнальная з тым, што адбываецца на берагах Альбіёна. Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала «Расія 1» палітолаг Уладзімір Карнілаў. «Глядзіце, які зараз сапраўды маштабны міграцыйны крызіс у Ла-Маншы паміж Францыяй і Вялікабрытаніяй. Прабачце мне, вось гэтыя 2-3 тысячы, хай 4 тысячы, кажуць, бежанцаў — гэта нішто на фоне таго, што зараз адбываецца на берагах Альбіёна». «Туды дзясяткі тысяч за гэты год прабраліся толькі афіцыйна. У мінулы чацвер быў устаноўлены абсалютны рэкорд: за суткі зафіксавана больш за 1,2 тысячы бежанцаў. За дзень! І што, іх танкі сустракаюць, расстрэльваюць, кідаюць іх назад у ваду? Не, прымаюць, рэгіструюць, кагосьці перапраўляюць назад. Але ўсё робіцца з дазволу французскіх улад. Макрон закрыў на гэта вочы», — сказаў Уладзімір Карнілаў. Палітолаг нагадаў, што Вялікабрытанія за год плаціць берагавой ахове Францыі 54 млн фунтаў. «І французы проста заплюшчваюць вочы. Чаму з Беларуссю нельга дамовіцца?» — адзначыў ён.

А калі тысячы курдаў пойдуць ламаць польскую «сцяну» ў пошуках нямецкіх аўтобусаў у Баварыю. Так палітычны аналітык, дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі Юрый Шаўцоў у сваім тэлеграм-канале пракаментаваў інфармацыю аб гатоўнасці шрагу нямецкіх гарадоў прыняць бежанцаў з беларуска-польскай граніцы. «Сюррэалізм рэальна нарастае. Хоць я б рыхтаваўся, хутчэй, да кадраў занесенага снегам лагера, дакладней лагераў, каля польскага калючага дроту. Ужо балюча катастрафічна для Польшчы выглядалі б гэтыя нямецкія аўтобусы», — заўважыў аналітык.

Захад выкарыстоўвае фактар бежанцаў як сродак для гібрыднай атакі на Беларусь і Расію. Аб гэтым у эфіры «Беларусь 1» заявіў расійскі палітолаг дацэнт Сяргей Карнавухаў. «Мы бачым, як заходнія краіны робяць усё магчымае, каб выкарыстоўваць фактар бежанцаў як сродак для гібрыднай атакі на Беларусь і Расію. Прычым іх вельмі мала. Трэба разумець, што гэта проста кропля ў моры. Яны маглі спакойна быць асіміляваны і прынятыя гэтымі дзяржавамі», — сказаў Сяргей Карнавухаў. Палітолаг нагадаў, што гэтыя людзі атрымалі статус бежанца не без удзелу калектыўнага Захаду. «Ірак, Сірыя, Лівія — вось адтуль ідуць гэтыя бежанцы. І першае, на чым трэба акцэнтаваць увагу, — гэта прамы абавязак Польшчы, Германіі і іншых краін ЕС забяспечыць прыняцце гэтых людзей і ўладкаванне ў сваіх краінах. Гэта яны вінаваты ў тым, што яны сталі бежанцамі і так моцна маюць патрэбу ў дапамозе, — перакананы палітолаг. — Цяпер тое, што датычыцца выкарыстання фактару бежанцаў у геапалітычным націску. Зразумела, што апошнія два гады звязаны з тым, што ЕС зрабіў сваёй асноўнай задачай — разбурэнне, атакі на Беларусь. Таму, безумоўна, яны выкарыстоўваюць гэты фактар. І мне чамусьці здаецца, што нават калі б адзін бежанец спрабаваў перайсці граніцу, — гэта стала б такой жа вялікай праблемай для Еўрасаюза».

Бежанцам здрадзілі двойчы. Аб гэтым у эфіры «Беларусь 1» заявіў старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк. «Не тэрарысты ідуць, не людзі з нейкімі радыкальнымі поглядамі, а якраз тая частка курдскага грамадства, якая, прабачце, найбольш успрымальная да заходніх «каштоўнасцяў». І людзі, якія горка ў гэтых каштоўнасцях расчараваліся», — адзначыў Ігар Марзалюк. Дэпутат падкрэсліў: гэтых людзей падманулі і здрадзілі ім двойчы. «Першы раз паабяцалі дзяржаўнасць, якую яны так і не атрымалі. Другі раз — калі яны, лічачы Еўропу «аазісам дэмакратычных каштоўнасцяў», прыйшлі на граніцу з Еўрасаюзам і сутыкнуліся з ксенафобіяй, расізмам, хамствам і прыніжэннем сваёй чалавечай годнасці», — адзначыў ён.

Мы назіраем новую форму міжнароднага тэрарызму. Аб гэтым у эфіры «Беларусь 1» заявіў аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін. «Мы павінны дакладна разумець, усведамляць, што сітуацыя з мігрантамі і жорсткая пазіцыя Польшчы па невыкананні Жэнеўскіх пагадненняў, патрабаванняў міжнародных дагавораў сведчыць аб тым, што ў рэчаіснасці Польшча выконвае нейкую задачу. І гэтая задача ніякім чынам не звязана з нацыянальнымі інтарэсамі Польшчы і не звязана са спробамі пошуку якіх-небудзь канструктыўных рашэнняў», — лічыць Аляксей Аўдонін.

Польшча ў сітуацыі з бежанцамі на граніцы выступае ў сваёй традыцыйнай ролі прафесійнага правакатара і падбухторшчыка. Такую думку БелТА выказаў загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін. «Карная аперацыя польскай арміі ў духу гітлераўскай Германіі пад сцягамі НАТА і Еўрасаюза адкрыла ўсяму свету сапраўдныя намеры і сутнасць карупцыйнага механізму мафіёзнага Захаду».

Эксперт канстатаваў, што, на жаль, лідары Старой Еўропы пакуль не ў стане ўсвядоміць, якую незваротную пагрозу ім нясе Польшча і яе гіпертрафіраваныя мэты і ганарлівасць. «Польшча стала праявай сімптаматычнай хваробы калектыўнага Захаду — гістарычнае бяспамяцтва і палітычная дэменцыя. Канструктыўны дыялог для Захаду з'яўляецца таблеткай праўды, таму ён і не ідзе на яго. Гібель польскага салдата на граніцы павінна была стаць сігналам польскай грамадзянскай супольнасці і чыноўнікам ЕС і НАТА аб злачыннай дзейнасці кіраўніцтва Польшчы. Але гэта толькі пачатак. Іншае пытанне — хто будзе адказваць, калі выпадковы снарад або аўтаматная чарга паляцяць у бок Беларусі і якія наступствы гэта будзе мець? У дадзеным кантэксце Аляксандр Лукашэнка паводзіць сябе ўпэўнена і стрымана і імкнецца знізіць градус напружанасці», — падкрэсліў аналітык.

**Пётр ДУНЬКО.**

### У тэму

З 1 жніўня бягучага года ў Беларусь не ўпусцілі каля 8 тысяч чалавек. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведаміў афіцыйны прадстаўнік ДПК Антон Бычкоўскі. «Яшчэ амаль 5 тысяч іншаземцаў, якія за названы перыяд уехалі ў Беларусь на законных падставах, у выніку прафілактычных мерапрыемстваў па недапушчэнні парушэння міграцыйнага заканадаўства пакінулі беларускую тэрыторыю, а гэта ж патэнцыяльныя мігранты. І гэта канкрэтныя, дакументальна пацверджаныя факты», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік ДПК.

### Меркаванне

**Аляксандр МАРКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы, выказаў свой пункт гледжання на падзеі на беларуска-польскай граніцы.**

Звярнуў ён увагу на паведамленне аб смерці вайскоўца Велікапольскай механізаванай брыгады, якое з'явілася ў выхадныя. Салдат загінуў не пры выкананні службовых паўнамоцтваў і не пры спыненні спроб прарыву мігрантамі граніцы. Па той інфармацыі, якая ёсць, адзначае дэпутат, можна меркаваць, што салдат памёр пры парушэнні мер бяспекі ў абыходжанні са зброяй. Не выключае Аляксандр Маркевіч і версію суіцыду. «Пра што гэтыя факты кажуць? Пра тое, што напружанне ўзрастае, што не толькі мігранты, але і асабовы склад воінскіх кантынгентаў знаходзіцца ў складаных, нязвыклых, стрэсавых умовах. Усё гэта разам павышае рызыку ўзнікнення канфліктных, нестандартных сітуацый», — лічыць дэпутат.

Паводле яго слоў, градус напружання на граніцы павышаецца з кожнай гадзінай. Спрыяе гэтаму нявызначанасць, у якой знаходзяцца мігранты, акружаныя з двух бакоў пагранічнікамі.

«Дзеянні могуць быць розныя і з боку мігрантаў, паколькі яны з кожнай гадзінай усё больш вымотваюцца і маральна, і фізічна. Таксама сярод іх ёсць адчайныя людзі, якія перыядычна ламаюць загароды і спрабуюць пераходзіць на польскую тэрыторыю. У адказ іх выцісakaюць, выкарыстоўваючы спецсродкі і гвалт. Дзе гарантыя, што хтосьці не прымяніць зброю пры спыненні такіх дзеянняў? Да таго ж няшчасны выпадак можа адбыцца як з вайскоўцам, так і з бежанцам», — дадае Аляксандр Маркевіч.

Папярэджвае ён і аб магчымасці масавага прарыву польскай граніцы бежанцамі «ўсім натоўпам». «І якія будуць далейшыя дзеянні польскіх сілавікоў, ніхто меркаваць не можа. Пра гэта таксама трэба думаць тым, хто прымае рашэнні ў Польшчы», — падкрэслівае парламентарый. На яго думку, для Польшчы няма рызыкі, што мігранты застануцца на яе тэрыторыі — яны імкнуцца трапіць у Германію.

Аляксандр Маркевіч прапануе Захаду праявіць палітычную волю ў вырашэнні міграцкай праблемы, каб прадухіліць далейшую эскалацыю канфлікту.

«А перспектывы — дэстабілізацыя абстаноўкі ў прыгранiччы, а ў далейшым і для ўсяго рэгіёна магчымыя неспрыяльныя наступствы. Трэба садзіцца за стол перагавораў, шукаць варыянты», — упэўнены намеснік старшыні Пастаяннай камісіі.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Столтэнберг ацаніў перспектывы ўступлення Украіны ў НАТА

**Генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг раскрыў перспектывы Украіны ўступіць у альянс. Яго словы передае ТАСС. Па словах чыноўніка, члены арганізацыі яшчэ не дасягнулі адзінства ў меркаванні па гэтым пытанні.**

«Пакуль яны не сталі членамі. Каб стаць сябрам НАТА, трэба адпавядаць стандартам НАТА. Мы дапамагаем ім змагацца з карупцыяй, але 30 саюзнікаў павінны дамовіцца, а зараз у нас у НАТА няма кансэнсуснай дамоўленасці адносна запрашэння Украіны стаць паўнапраўным членам», — заявіў Столтэнберг. Ён таксама паведаміў, што прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі хоча «нешта большае», чым падтрымкі з боку альянсу, а менавіта дамагчыся «паўнапраўнага членства» ў арганізацыі.

НАТА і Еўрасаюз неаднаразова падкрэслівалі, што змогуць разглядаць членства Украіны ў альянсах толькі пасля праведзення Кіевам глабальных рэформ у краіне.

### Таксіст у Ліверпулі зачыніў тэрарыста ў машыне і прадухіліў тэракт

**Масавае забойства людзей з дапамогай выбуховага прыстасавання ў Ліверпулі здолеў прадухіліць таксіст. Ён замкнуў меркаванага смяротніка ў сваёй машыне і такім чынам пазбег тэракта. Падрабязнасці аб падзеях передае таблоід The Sun.**

Па папярэдніх даных, кіроўца па імені Дэвід Пэры змог спыніць машыну, выскачыць і замкнуць яе, перш чым яго пасажыр прывёў у дзеянне выбуховае прыстасаванне і загінуў. Ён, верагодна, збіраўся атакаваць натоўп, які сабраўся ў саборы ў Дзень памінання — дату, прысвечаную памяці загінулых у Першай сусветнай вайне.

# МЯЖА. НЕПЕРААДОЛЬНАЯ?

















Фота БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34) проводит открытый аукцион по продаже имущества КТУП «Солигорский горплодоовощторг» (223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Набережная, 16) в составе:**

## ЗДАНИЕ ВЕСОВОЙ, инв. № 644/С-59706

**общей площадью 98,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012001703 площадью 0,0275 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 41, Любанское шоссе.**

Начальная цена с НДС – **10 440,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 044,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%) (покупатель).

Аукцион состоится **20.12.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра (8029) 335 74 49.**

УНП 600122835

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит шестые повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Минскторгавтотранс», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот, руб. без НДС | Шаг торгов, руб., без НДС | Задаток для участия в торгах, руб. без НДС |
|---|---|---|---|---|
**Дата, время и место проведения аукциона: 17.12.2021 в 11.30 по адресу: 211527, Витебская обл., Ушачский р-н, д. Жары, ул. Центральная, д. 18 в здании Жарского сельского исполнительного комитета. Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 17.11.2021 до 15.00 16.12.2021 в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с:** BY84 AKBB 3641 3280 4002 3230 0000 ОАО АСБ «Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, г. Минск, УНП 300007203, получатель – Жарский сельский исполнительный комитет. **Условия аукциона: Победитель аукциона либо единственный участник обязан**: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением документации, необходимой для его проведения; в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона обратиться за гос. регистрацией права на земельный участок в Ушачское бюро Лепельского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220**. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

## ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект», опубликованной в газете «Звязда» 26.02.2021 г.,

**по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской–ул. Глаголева–пр-т Жукова в г. Минске 3-я очередь строительства 3-7-я секции»**

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 124,88 кв. м, расположенного в 4-й секции на 1-м нежилом этаже с обособленными входами непосредственно с улицы с дворовой территории и из арки.

Высота помещения составляет 3,55 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

Встроенное помещение передается с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенного помещения выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена вертикальная и горизонтальная (в конструкции стяжки пола) разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенного помещения – приточно-вытяжная. Водоснабжение встроенного помещения – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитаза. Электроснабжение встроенного помещения – разводка до вводного устройства с установкой вводного устройства и счетчика. Запроектировано строительство пассивной оптической сети, предусматривающей телефонизацию и телефикацию по протоколу IP и подключение к Интернету по технологии xPON – ввод сетевого кабеля в помещение, оптическая розетка. Встроенное помещение оборудуется автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения – типа «СО-2». По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договора создания объекта долевого строительства предлагается помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1 500,00 долларов США.**

**Условия оплаты:** оплата 100 % стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику могут быть предоставлены скидки от общей стоимости объекта, либо иные условия его оплаты.

УНП 191581623

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

**ОАО «Торфопредприятие Глинка» (Продавец)**

**Лота № 1:** автовесовая, инв. № 135/С-14578, 141 кв. м, Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2/3. Земельный участок 125885201601000115, 2.6560 га. Начальная цена с НДС – 16 054,21 руб. Задаток – 1 605,42 руб. Шаг аукциона – 5 %. Штраф – 5 000,00 руб.

**Аукцион состоится 14.12.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков 10.12.2021 в 11.00.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении 30 ноября 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение* с инв. номером 110/С-113573, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 133 200,00 | 13 300,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/2, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание арочного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245 | 49 800,00 | 4 900,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117136, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/3, общей площадью 209,0 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0427 га, кадастровый номер – 141000000001005219 | 25 260,00 | 2 500,00 |
| 4 | Капитальное строение** с инв. номером 110/С-113574, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/4, общей площадью 466,2 кв. м, наименование – здание холодильника, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0997 га, кадастровый номер – 141000000001005218 | 61 200,00 | 6 100,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/6, общей площадью 1 212,7 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 146 400,00 | 14 600,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117137, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/9, общей площадью 855,6 кв. м, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000001005217 | 102 000,00 | 10 200,00 |
| 7 | Капитальное строение*** с инв. номером 110/С-114895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/10, общей площадью 737,0 кв. м, наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1753 га, кадастровый номер – 141000000001005244 | 88 200,00 | 8 800,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/11, общей площадью 775,1 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211 | 81 600,00 | 8 100,00 |
| 9 | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-117143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/12, общей площадью 212,7 кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212 | 26 640,00 | 2 600,00 |
| 10 | Капитальное строение**** с инвентарным номером 110/С-114896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/13, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213 | 25 920,00 | 2 500,00 |
| 11 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117142, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/14, общей площадью 291,7 кв. м, наименование – здание кирпичного гаража, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | Площадь – 0,0980 га, кадастровый номер – 141000000001005240 | 34 740,00 | 3 400,00 |
| 12 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/15, общей площадью 703,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243 | 82 200,00 | 8 200,00 |
| 13 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/16, общей площадью 227,5 кв. м, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака | Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214 | 27 000,00 | 2 700,00 |
| 14 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/17, общей площадью 317,2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1457 га, кадастровый номер – 141000000001005215 | 23 820,00 | 2 300,00 |

**Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, рекомендуется осмотр**

* Ограничения (обременения): аренда до 31.12.2021 г.
** Ограничения (обременения): аренда до 11.07.2022 г.
*** Ограничения (обременения): аренда до 31.03.2022 г.
**** Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 30.11.2021 по предмету торгов № _ _.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **30 ноября 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.11.2021 по 26.11.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

*Рэчыцкі р-н, вёска Шоўкавічы*

# МОЙ ХРАМ ЗБУДАВАНЫ Ў ДУШЫ

**Аднойчы закарцела прачытаць Біблію.**

**Узброіўся алоўкам ды цярпеннем і пачаў спакваля араць друкаванае поле. Неўзабаве адчуў, што мая ралля сама сабой засяваецца адборным зернем слоў. За два гады няспешнага чытва мой нататнік напоўніўся жыццёвымі афарызмамі. Яны адлежваліся ў памяці, шавялілі душу. І я ўзяўся расшыфраваць біблейскія павучанні. Так з'явіліся мае малітвы, якія пайшлі да людзей асобнай кнігай «Памілуй і ўзвысь».**


У Шоўкавічах.

## Мае малітвы

Цяпер прызнаюся ў двух цікавых момантах.

Аднойчы сеў пісаць, а слоў няма. І думкі як бы закончыліся. І настрой згубіўся. І нейкая скруха падвярнулася. Мільганула думка: «Трэба ставіць кропку і болей не складаць малітвы». Падлічыў напісаныя. О, Госпад! Іх трыццаць тры, як сыну Божаму гадоў. Нехта ж падаў мне сігнал, што далей пісаць нельга!

А перад гэтым быў выпадак. Іду на возера, каб адпачыць ад творчых мук. Перад тым як закінуць вуду, прамовіў услых: «Божа, дай пяць рыбін!..» І пусціў паплавок на хвалі. Праз некалькі хвілін выцягваю ладную, серабрыстую плотку. Другі раз закідваю — новая ўдача. От і няпраўду казалі рыбакі, што сёння няклёўны дзень. Далей пайшло яшчэ спрытней. На кручку затрапятала трэцяя, чацвёртая, пятая рыбіна. У азарце закідваю вуду зноў. У тое ж самае месца. І раптам — зачэп і абрыў лескі. От, браток, прасіў пяць, дык чаго ж не ўтаймуеш прагнасць?

І я паверыў. Эпіграф да маіх душэўных споведзяў стаўся да месца: «Чалавек павінен верыць ці шукаць веру, інакш ён пусты чалавек». Гэты запавет пакінуў нам геній мастацкага слова Антон Паўлавіч Чэхаў.

Мае малітвы ў дапоўненай рэальнасці, якая змешчана ў кнізе, чытаюць заслужаныя артысты Беларусі Валерый Анісенка і Леанід Улашчанка. Я ж, каб не быць галаслоўным, хачу даверыць чытачам першую малітву. Эпіграф да яе ўзяты са Святога Евангелля паводле Мацвея, раздзел 11, пункт 8: «Прыйдзіце да мяне, усе спрацаваныя і абцяжараныя, і я супакою вас». Цяпер мой тэкст:

*Святы Божа, моцны*
*і несмяротны!*
*З гадамі ўсё выразней чую*
*Твой поклічны голас,*
*усё даверлівей раблю крок*
*да спазнання вечнасці.*
*І пачынаю адчуваць малітву.*
*Яна — мой голас любові.*
*Яна аднаўляе маё сэрца,*
*скарачае шлях*
*паміж зямлёй і небам.*
*Адчуваю:*
*Станаўлюся не рабом Тваім,*
*а паслухмяным дзіцем.*
*Крыху маёй дабрыні,*
*крыху маёй надзеі,*
*крыху маёй любові,*
*памножаныя на тваю ласку,*
*робяць мяне чалавекам.*
*Я паверыў:*
*лепш спадзявацца і верыць,*
*каяцца і маліцца,*
*чым заставацца ў роспачы.*
*Паслухмянасць Табе —*
*наша выратаванне.*
*Яна — праведнасць,*
*якая ніколі не апаганьваецца.*
*Яна — святло,*
*якое ніколі не тухне.*
*Яна — мудрасць,*
*якая ніколі не падводзіць.*
*Яна — крыніца,*
*якая ніколі не высыхае.*
*Да Цябе іду я.*
*стомлены, грэшны, пакутны.*
*Супакой мяне, Божа.*
*Амін.*

Маё пранікненне ў біблейскія тэксты натхніла, надало веры напісаць для дзяцей пазнавальную кнігу «Як Бог стварыў свет». Тыражом у пяцьдзясят тысяч экзэмпляраў яна ўміг разляцелася па сем'ях, якія выхоўвалі спадчыннікаў.

Францыск Скарына пісаў, што ў Бібліі схавана мудрасць, як моц у дарагім камені, як золата ў зямлі, як зерне ў арэху. І я пастараўся адкрыць гэты скарб сваім даверлівым чытачам. Раскошныя малюнкі да кнігі зрабіў выбітны мастак Уладзімір Пашчасцеў. І я сам найперш наталіўся духоўнай ежай, як казаў святы Іаан Залатавуст, якая ўпрыгожвае розум і робіць душу моцнай, цвёрдай, мудрай. Па-новаму, свежа і глыбока, адгукнуліся ў памяці малюнкі майго дзяцінства.

## Абразок з бацькоўскага дому

Прыгадаў, як адразу пасля вызвалення нашых Шоўкавічаў нехта з вяскоўцаў прывёз на кані барадатага, вусатага, даўгагрывага папа. Нас, пацанву, сабралі ў хаце векавухі Кулачэнчыхі. І той страшнаваты вернік заспяваў перад намі. Голас маладзецкі, звонкі. Мы крыху супакоіліся, даверыліся яму. А ён раптам абмачыў у вадзе сваю мяцёлачку і пачаў пырскаць на нас. Спяваў свае прыгаворкі, каб раслі здаровымі, паслухмянымі.

З таго дня мы лічыліся хрышчонымі, далучанымі да нейкіх тайнаў нябёсаў. Мама радавалася за мяне. Падвяла да покуці і паказала, як трэба вітацца з Хрыстом. На іконцы намаляваны хлопчык, мо аднагодак мой. Вочы ў яго вялікія, ясныя, твар светлы. Апрануты ў маечку. Падтрымлівае левай рукой на каленях мілага паслухмянца — баранчыка, а ў правай трымае драўляны крыжык, перавязаны блакітнай стужачкай. Вакол галавы таго хлопчыка — жоўты арэол, як бы сонейка агарнула яго, саграваe і лашчыць.

Пазней даведаўся пра гісторыю хатняга абраза. Мама мая Марыя з ім прыйшла ў замужжа да бацькі Сцяпана. У новай хаце іконка займела свой ганаровы кут у святліцы. Перад ёй кідалі крыж на сябе бацькі, сёстры Ліда, Клава, Люба, браты Пеця і Коля. А калі я нарадзіўся, усе разам сабраліся і перахрысціліся перад Хрыстосікам з баранчыкам, каб яны, святыя, памагалі мне расці.

Цяпер разумею адзін бацькаў учынак.

Калі нашу вёску збіраліся паліць, партызан на кані праскочыў галопам па вуліцы і папярэдзіў: «Ратуйцеся!.. Ідзе карны атрад!..» І паказваў рукой у бок Хаўруснага, куды трэба ўцякаць. Там лес, балота — зручная схованка.

Мама ўхапіла мяне малога. Астатнім дзецям загадала чапляцца за яе падол. Усе разам пабеглі ў ратавальню. А бацька зняў іконку, ухапіў чыгунок бульбы з печы і даёнку.

Цяпер тая іконка — мая дамашняя рэліквія. Яна — побач з фатаграфіямі мамы і бацькі. Я іх называю святымі людзьмі і напісаў пра іх свае мо самыя лепшыя кнігі «Мама. Малітва сына», «Бацька. Лісты на неба». Гэта і мае споведзі перад тымі, хто запаліў свечку жыцця, і маё шчырае прызнанне ў любові, і мая падзяка за выхаванне, навуку ды за іх ціхія малітвы за нас, шасцярых спадчыннікаў.

## Царква ў Сведскім

У нашых Шоўкавічах ніколі не было аніякага храма. І суседнія вёскі Вузнаж, Задзірэўка, Восаў, Шупейкі, Баравікі, Чарнейкі — без малітоўняў. Гэта ўжо ў Рэчыцы, за сорак кіламетраў ад нашай хаты, стаяла мураваная Саборная Успенская царква. Там былі і касцёл, і сінагога, і малітоўныя дамы, і царкоўнапрыходская школа. Гэта на той час, калі мае бацькі хадзілі басанож ды калі звілі сваё сямейнае гняздо Ліпскіх-Янушэўскіх.


Вёска Сведскае, Рэчыцкі раён. Дзесьці тут стаяла Ільінская царква.

Мае архіўныя раскопкі ўсё-ткі абнадзеілі, што царкоўны прыход існаваў у вёсцы Святое, Сведскае. А гэта ж, калі перайсці балотную нашу рэчачку Стоўпінку, ды адолець па кладках чарнейкаўскі алёс, ды выйсці на сенажаць, дзе бруіцца рэчачка Сведзь, прыток Бярэзіны, то каля яе берагоў і знойдзем Сведскае. Гэту вёску мо і назвалі так свята, што ў ёй была царква? Малельня называлася Ільінскай царквой, у ёй ушаноўваўся абраз святога прарока Ілы. Апякункай царквы была горвальская памешчыца Марыя Халадоўская. Усе гэтыя звесткі датычацца канца дзевятнаццатага стагоддзя, калі нарадзіўся мой бацька Сцяпан. І я маю права верыць, што яго хрысцілі ў той лясной вёсцы, у тым драўляным храме.

Дзе маму хрысцілі, адкуль у яе іконка з маленькім Хрыстосікам — тайна неразгаданая. Але святыня пры мне, і яна саграваe душу. Надае веры ў тое, што ў маіх Шоўкавічах, у яго чароўным лясным наваколлі жыве сам Бог. Як жа яму не бываць у гэтым памесці, калі тут вырасла Шоўкаўская дубрава, што ахоўваецца дзяржавай. У нас самыя духмяныя кветкі і травы. Тут самыя працавітыя людзі і пчолы. Над вёскай — самыя зіхатлівыя зоркі, а ў поўню можна на пясчанай вуліцы адшукаць згубленую ўдзень іголку.

## Дзе гэта мясціна?

Не шукайце маіх Шоўкавічаў у старых друкаваных радках, на самых вялікіх картах. Яна — у царстве туманоў, лясоў, балот. І пасяліцца тут маглі толькі смелыя, мазольныя, улюбёныя ў прыроду ды ў саміх сябе, у свой адвечны радавод людзі. Назва маёй вёскі рэдкая, можа, адзіная на ўсё Палессе. Ад чаго, ад каго яе імённе?

Кажуць, жыў тут некалі Мамэрт. Людзі яго панам назвалі. А ён служыў стражнікам у панскім лясніцтве. Ездзіў на брычцы. Бачыўся і знаўся з панамі. Ездзіў па адным лесе з імі, дык для цёмных людзей гэтага даволі, каб лічыць і яго панам, бо сам ён зямлі не араў, сенажаці не касіў, а трымаў парабкаў. Але самае галоўнае — насіў той Мамэрт лапці з шоўкавымі аборамі. Дык вось, кажуць, ад тых шоўкаўных абораў і пайшла назва вёскі.

А я болей давяраю вось гэтай легендзе. На нашых палетках, адваяваных ад бароў і дуброў, вельмі радзіў лён. Як цвіў, здаецца, сінія азярыны гайдаліся хвалямі ледзь не да саменькіх хат. Нібыта Шоўкавічы тады пазіралі ў сусвет вялізнымі блакітнымі вачыма. І шоўкаўцы спадзяваліся, што ўсе, хто гойсаў той парой па Млечным Шляху, Бог і анёлы бачаць іх адкрытыя, добрыя вочы. Таму з асаблівай пяшчотай даглядалі льняныя палеткі. Пасля шчыравалі, каб давесці да ладу ўраджай.

Магчыма, было так: прабіліся нашы льнаробы праз царства туманоў на рэчыцкі ці шацілкаўскі рынак, каб абмяняць лён на соль, свечкі, цвікі, а там сустрэўся шчыры гандляр, не стрымаў свайго захаплення: «Дык у вас жа не лён — шоўк!» І закупіў увесь тавар. А пасля чутка пайшла пра майстроў, пачалі цікавіцца: «Дзе тыя шоўкаўцы?.. Калі зноў прывязуць свой шоўкавы лён?..»

Вось і нарадзілася назва паселішча — Шоўкавічы. Яно вядомае з васямнаццатага стагоддзя. Пачыналася з аднадворнікаў. А ў маім дзяцінстве тут гудзеў чалавечы вулей — болей за дзве сотні жыхароў. Вайна разбурыла вясёлы «вулей». Вёску карнікі спалілі да попелу. Дзесяць жыхароў загінулі, а дваццаць пяць маладых, здаровых хлопцаў не вярнуліся з фронту. Усё радзей і радзей спраўляліся тут вяселлі, хрэсьбіны. А ўсё часцей і часцей шоўкаўцы перасяляліся на пагост, дзе сосны і дубы нашэптваюць ім вечны супакой.

## Вясковыя могілкі

Адчыняю брамку. Гнятлівая, даўкая цішыня цісне на вушы і сэрца. Ад яе пяршыць у горле. Бачу: многія крыжы падгнілі, паабвальваліся. На іх — сівы мох. Па кім захоўваюць памяць?

Іду паміж строя магілак... Раман з жонкай... Ясіха з мужам... Ігнась і Матрэна — брат і сястра... Іван Новікаў з дачкой... Паўлік з бацькам... Чатыры сястры ўпокат — Анэта, Раіна, Каця, Жэня... Дзед Сцяпан з жонкай, дачкой, унукам Шурыкам...

Стаю пад дубам, прыгадваю кожнага. Божа, пад плітамі закапаны чалавечыя гісторыі, цэлая бібліятэка. І ніхто ўжо не прачытае іх. Крыўдна!

Недзе за шатамі дрэў, высока ў небе гудзе самалёт. Ды раптам капае дождж. Плача рэдкімі кроплямі. Пасля лінуў тонкімі струменьчыкамі.

Дождж на могілках. Упершыню бачу, як мыюцца, прыхарошваюцца шоўкаўцы. Капаюць дажджынкі на фарфоравыя партрэты. Расцякаюцца па тварах. Э-э, ды гэта ж яны не мыюцца, а плачуць. Правёў рукой па сваім твары — вільгота і на мне. Толькі не халодная, а спякотная...

Дык вось жа зразумеў на той сустрэчы з шоўкаўцамі, што ўсе яны былі і вернікамі, і святарамі адначасна. Яны, як самую дарагую свечачку, перадавалі з душы ў душу прыгажосць свайго Божага куточка, дабрыню сваіх сэрцаў і міласць да ўсіх жывых. Каб бераглі сваю зямельку, не гублялі памяці пра бацькоў, якія далі жыццё, пра ўсіх шоўкаўцаў, якія верна служылі Божым запаветам.

Атрымліваецца, што мой храм збудаваны ў самой душы. Я малюся ў ім, калі бачу ўзыход новага дня. Я спавядаюся ў ім за кожны пражыты дзянёчак. І за ўсё ўдзячны Маме, Бацьку, сваім шоўкаўцам і Шоўкавічам, якія — жывая вада для мяне, мора духоўнага багацця. Усе разам яны высвяцілі для мяне жыццёвую зорку, па якой звяраю свой шлях на зямлі.

Ні мае бацькі, ні ўсе шоўкаўцы не хадзілі ў храм, не адбівалі паклоны ў царкве. Але я адчуваў іхнія ўнутраныя, маўклівыя малітвы. Можа б, і нам часцей звяртацца да найчысцейшай Маці Божай, а ў яе вобразе ўяўляць і сваю Маму як анёла-ахоўніка, як заступніцу нашу. Звяртаймася да нябёсаў не толькі ў горы, бядзе, смутку, але і ў радасцях, пры ўсялякіх удачах. Шчаслівей даваць, чым браць. Дык навучымся, людзі, шчыра аддаваць сваю дабрыню, ласку, спагаду, міласэрнасць. Усё, што аддаваў, тое і тваё. Хай жа кожны з нас робіць толькі добрыя справы. Навучымся цешыцца з тымі, хто радуецца, і плакаць з тымі, хто плача. Мацуйма сябе ў веры, надзеі, любові.

*Кастрычнік 2021 г.*

**Уладзімір ЛІПСКІ.**

Трансфармацыя

# СПАДЧЫНА ПЕРАХОДЗІЦЬ У ЛІЧБУ

**Мы няўмольна набліжаемся да новага ўзроўню спажывання ведаў. Бібліятэкі, музеі, архівы свету актыўна алічбоўваюць свае фонды. Паўстала і перад Беларуссю задача стварэння ўласнай электроннай бібліятэкі, і спрычыніцца да гэтай справы мусяць вядучыя кніжныя скарбніцы — нацыянальная і абласныя бібліятэкі.**

Стварэнне электронных копій дазваляе не толькі пашырыць доступ да інфармацыйных крыніц, але і захоўваць рэдкія дакументы ці папяровыя носьбіты, якія пад уздзеяннем часу рызыкуюць разбурацца. Напрыклад, такі лёс можа чакаць газеты, што выходзілі ў мінулым стагоддзі. Іх выдаўцы не ставілі перад сабой задачы, каб перыёдыка служыла працяглы час, шырока выкарыстоўвалася танная папера. Яна жаўцее, становіцца крохкай, рассыпаецца, губляюцца тэксты. І таму сёння ва ўсім свеце ўдзяляецца асаблівая ўвага алічбоўцы менавіта рэтраспектыўных газет.

Вядзецца такая работа і ў Беларусі. Задачы, якія стаяць сёння перад бібліятэкамі, абмяркоўваліся падчас круглага стала «Стварэнне калекцый у лічбавым выглядзе як спосаб захавання папяровых нацыянальных дакументаў», што прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы.



Перад алічбаваннем некаторыя газеты трапляюць на рэстаўрацыю.

## МІСІЯ — ЗАХАВАЦЬ МІНУЛАЕ

Як паведаміла **загадчык аддзела захоўвання спецыялізаваных фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Юлія ЦВЕРДАХЛЕБАВА,** газетны фонд галоўнай кніжнай скарбніцы Беларусі прадстаўлены выданнямі з канца XVIII стагоддзя і ўключае газеты дарэвалюцыйнага, міжваеннага, ваеннага і пасляваеннага перыядаў, дакументы краін постсавецкай прасторы, а таксама сучасныя крыніцы. Аб'ём газетнага фонду — больш за 50 тысяч гадавых камплектаў на 25 мовах свету.

Асабліва каштоўнай часткай з'яўляецца калекцыя нацыянальных газет, якія з'яўляюцца неад'емным гісторыка-культурнай складальнікам спадчыны нашага народа. Гэта каля 66 працэнтаў ад агульнага газетнага фонду. Сюды ўваходзяць у тым ліку газеты ўжо зліквідаваных абласцей і раёнаў.

Але гэта яшчэ не ўся газетная спадчына. У фондах Нацыянальнай бібліятэкі не хапае як асобных нумароў пэўных выданняў, так і наогул падшывак некаторых газет. Прычын таму некалькі. Калекцыя пачала стварацца ў 20-х гадах мінулага стагоддзя, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны многае было страчана. У пасляваенныя гады не хапала памяшканняў для захавання фондаў, якія пастаянна папаўняліся, і забеспячэння ў іх неабходнага светлавога, вільготнаснага і санітарна-гігіенічных рэжымаў.

Сёння бібліятэка прыкладае шмат намаганняў, каб папоўніць фонды, актыўна ўзаемадзейнічае з архівамі краіны, у якіх таксама захоўваюцца перыядычныя выданні. Такая праца дазволіць зрабіць гэтыя крыніцы больш даступнымі для даследчыкаў, бо ў архівах, напрыклад, праз электронныя пошукавыя сістэмы не заўсёды можна знайсці звесткі пра канкрэтныя нумары газет. Да таго ж важна сабраць па максімуме крыніц на адным электронным рэсурсе. Таму разгорнута шырокая праца па пошуку ў фондах архіваў краіны газет, якіх не мае Нацыянальная бібліятэка. Напрыклад, толькі ў дзяржархіве Брэсцкай вобласці, які ўключае газеты, што выдаваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час (1919—1939), часоў нямецка-фашысцкай акупацыі, а таксама пасляваенную перыёдыку, было выяўлена 125 найменняў (больш за 3800 экзэмпляраў).

Падшыўкі Нацыянальнай бібліятэкі, у якіх не хапае пэўных нумароў, могуць папаўняцца электроннымі аналагамі.

У будучыні плануецца зрабіць доступ да лічбавых копій у тым ліку ў аддаленым рэжыме.

Шмат робіцца для папулярызацыі такой шыкоўнай крыніцы гісторыі, як перыёдыка. Напрыклад, сумесна з Нацыянальным архівам РБ бібліятэка падрыхтавала электроннае выданне «Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: па старонках газет 1917—1922 гадоў».

Толькі віртуальнай рэканструкцыяй газет справа не абмяжоўваецца, супрацоўнікі бібліятэкі прыкладаюць намаганні для таго, каб захаваць арыгіналы. Перад тым як алічбаваць пэўныя нумары газет, ацэньваецца іх стан, і пры неабходнасці газеты трапляюць да рэстаўратара. Калі не прыбраць заломы, не разгарнуць памятыя газеты, не замацаваць фрагменты, якія выпадаюць, не атрымаецца якасная лічбавая копія, і даследчыкі, што шукаюць звесткі пра мінулае, не даатрымаюць важнай інфармацыі. А менавіта старыя газеты — вельмі запатрабаваная крыніца ў краязнаўцаў, гісторыкаў, этнографаў.

## АДЗІНАЯ БАЗА

Стварэнне нацыянальнай электроннай бібліятэкі — адзін з пунктаў стратэгіі ўстойлівага развіцця. Задача алічбоўкі фондаў бібліятэк і музеяў уключана ў праграму «Культура Беларусі» на 2021—2025 гады. Вызначаны паказальнік для Нацбібліятэкі па папаўненні фонду дакументаў у электронным выглядзе: да канца 2025-га аб'ём дакументаў павінен складаць 18 мільёнаў старонак. На сёння мы маем больш за 600 тысяч дакументаў у складзе электроннай бібліятэкі (гэта каля 13,6 млн старонак).

Натуральна, алічбаваць увесь нацыянальны фонд толькі сіламі адной бібліятэкі проста нерэальна, таму развіццё і супрацоўніцтва бібліятэк сёння з'яўляецца ключавой задачай. Паступова вырашаецца праблема з забеспячэннем бібліятэк сканавальным абсталяваннем. Ёсць і яшчэ адна задача, якую трэба вырашаць, — стварэнне айці-структуры для захавання электронных дакументаў і забеспячэння доступу да іх у карыстальнікаў.

У 2003 годзе Нацыянальная бібліятэка прыступіла да алічбавання сваіх фондаў. У першую чаргу ствараюцца віртуальныя копіі найбольш рэдкіх выданняў, рукапісаў, старадрукаў, крыніц, якія знаходзяцца ў дрэнным фізічным стане. Для зручнасці карыстальніка ствараюцца тэматычныя калекцыі. Асаблівая ўвага — дакументам гістарычнага зместу. Сярод іх — крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX стагоддзя, што ўтрымліваюць рэдкія выданні, такія як акты і памятныя кніжкі губерняў Расійскай імперыі. Адной з самых вялікіх з'яўляецца калекцыя «Кніга канца XIX — пачатку XX стагоддзя»: нарысы вядомых тагачасных краязнаўцаў, творы беларускіх пісьменнікаў, кнігі савецкага перыяду, якія адлюстроўваюць гісторыю зараджэння Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Створаны электронныя рэсурсы па перыядычных выданнях Беларусі другой паловы XVIII стагоддзя — 1917 года, работа над якімі пачалася ў 2008 годзе. На сёння прадстаўлена 177 найменняў перыядычных выданняў. Асаблівую значнасць у гэтай калекцыі ўяўляюць «Губернскія ведамасці», якія выходзілі з 1838 да 1917 года, і «Епархіяльныя ведамасці». Гэтыя выданні ўтрымліваюць урадавыя пастановы, загады, распараджэнні сінода, царкоўную хроніку, агляд літаратуры, звесткі пра фальклор і этнаграфію.

Вартыя ўвагі і першыя беларускія газеты — «Наша ніва» і «Наша доля». Прычым работа па выяўленні крыніц працягваецца дзякуючы супрацоўніцтву з архівамі і бібліятэкамі краіны.

Сёння створаны і віртуальны праект, скіраваны на папулярызацыю кніжнай спадчыны Беларусі, яе гісторыі і культуры. Рэсурс «Культура і мастацтва. Электронная калекцыя Нацыянальнай бібліятэкі» ўтрымлівае бібліяграфічныя запісы на кнігі, артыкулы са зборнікаў, часопісаў і газет па пытаннях культуры і мастацтва Беларусі, брашуры, навуковыя зборнікі, дысертацыі.

**Газетны фонд галоўнай кніжнай скарбніцы Беларусі прадстаўлены выданнямі з канца XVIII стагоддзя і ўключае газеты дарэвалюцыйнага, міжваеннага, ваеннага і пасляваенных перыядаў, дакументы краін постсавецкай прасторы, а таксама сучасныя крыніцы. Аб'ём газетнага фонду — больш за 50 тысяч гадавых камплектаў на 25 мовах свету.**

Яшчэ адна калекцыя «Мода і час» прадстаўлена каля 600 выданнямі на розных мовах. Гэта кнігі, артыкулы, ілюстраваныя часопісы аб модзе і больш за 400 мастацкіх дакументаў: малюнкі і фатаграфіі адлюстроўваюць тэндэнцыі моды ў розных краінах свету з сярэдзіны XVI да сярэдзіны XX стагоддзя.

Пачалася работа па стварэнні электроннай калекцыі «Майстры беларускай культуры». Ужо ёсць паўнатэкставыя рэсурсы, прысвечаныя Яўгену Глебаву і Уладзіміру Алоўнікаву.

Адна з самых вялікіх віртуальных калекцый складаецца з лічбавых копій часопісаў 1919—1939 гадоў. Гэта 270 найменняў перыядычных выданняў, што выходзілі на тэрыторыі БССР і Заходняй Беларусі. Яны ўтрымліваюць звесткі аб грамадска-палітычным, эканамічным і культурным жыцці краіны.

Гэтыя і іншыя рэсурсы стануць асновай нацыянальнай электроннай бібліятэкі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Кніжныя навіны

# Новы шлях з Казахстана — у Беларусь

**Паэт, празаік і перакладчык Міхась ПАЗНЯКОЎ завяршыў працу над перакладам на беларускую мову легендарнай эпапеі класіка казахскай літаратуры Мухтара АЎЭЗАВА «Шлях Абая». Толькі што ў мінскім выдавецтве «Колорград» пабачыў свет чацвёрты том рамана-эпапеі. Выданне ажыццёўлена па заказе Пасольства Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь.**

Галоўны герой рамана — рэальная гістарычная асоба, вялікі паэт, мысляр Абай Кунанбаеў. У творы разгорнута панарама поўнага драматызму і супярэчнасцяў народнага жыцця, быту і нораваў качавых і аселых стэпавікоў другой паловы XIX стагоддзя, яскрава паказаны шырыня і харатво вольналюбівай душы казахскага народа, яго мары аб лепшым, яго надзеі і памкненні, своеасаблівы духоўны ўклад, нацыянальны характар.

Некалькі гадоў таму ў Мінску пабачыла свет кніга самога АБАЯ — «Стэпавы прастор» у перакладзе на беларускую мову. Пераўвасобіў паэтычнае слова светача казахскага народа лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры і мастацтва Мікола МЯТЛІЦКІ. Па-беларуску ў апошнія гады выйшлі адразу тры кнігі казахскага літаратуразнаўца, празаіка, публіцыста Немата КЕЛІМБЕТАВА: «Не хачу губляць надзею», «Лісты да сына», «Зайздрасць». Стасункі Беларусі і Казахстана на ніве прыгожага пісьменства становяцца ўсё шырэйшымі і шырэйшымі.

**Раман СЭРВАЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **склад-холодильник** *(составные части и принадлежности: 3 (три) навеса)*, **инв. № 601/С-31936, общей площадью 145,8 кв. м;**
- **убойный цех** *(составные части и принадлежности: 2 (два) навеса)*, **инв. № 601/С-31941, общей площадью 1000,4 кв. м, с технологическим оборудованием «Szlachet-Stal»;**
- **столярный цех, инв. № 601/С-31938, общей площадью 460,1 кв. м;**
- **склад канцкормов** *(составные части и принадлежности: операторская, навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31943, общей площадью 402,2 кв. м;**
- **склад ГСМ, инв. № 601/С-31937, общей площадью 64,5 кв. м;**
- **свинарник, инв. № 601/С-31935, общей площадью 296,4 кв. м;**
- **сарай-гараж с/х** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-31929, общей площадью 553 кв. м;**
- **пункт техобслуживания, инв. № 601/С-31932, общей площадью 719,9 кв. м;**
- **птичник №14, инв. № 601/С-31925, общей площадью 1329,2 кв. м;**
- **проходная, инв. № 601/С-31942, общей площадью 49 кв. м;**
- **мойка для машин, инв. № 601/С-31928, общей площадью 6,6 кв. м;**
- **мехмастерская** *(составные части и принадлежности: пристройка, беседка)*, **инв. № 601/С-31927, общей площадью 565,7 кв. м;**
- **котельная** *(составные части и принадлежности: насосная, дымовая труба)*, **инв. № 601/С-31939,общей площадью 892,9 кв. м;**
- **гараж на 25 автомашин, инв. № 601/С-31926, общей площадью 506,9 кв. м;**
- **ветсанпропускник убойного цеха** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-31940, общей площадью 578,2 кв. м;**
- **административное здание** *(составные части и принадлежности: подвал, 2 (две) пристройки, котельная)*, **инв. № 601/С-31931, общей площадью 1072,1 кв. м;**
- **весовая** *(составные части и принадлежности: навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31934, общей площадью 15,2 кв. м;**
- **птичник № 1** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22689, общей площадью 1749,7 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 2** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22690, общей площадью 2003,8 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» для выращивания бройлеров напольного содержания;**
- **птичник № 3** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22691, общая площадь – 1752,7 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 4** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22692, общей площадью 1789,8 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» для выращивания бройлеров напольного содержания;**
- **птичник № 5** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22693, общей площадью 1753,2 кв. м, с оборудованием «Техна» для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 6** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22694, общей площадью 1411,8 кв. м;**
- **птичник № 7** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки, уборная)*, **инв. № 601/С-22695, общей площадью 1424 кв. м;**
- **птичник № 8** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22696, общей площадью 1318 кв. м;**
- **птичник № 9** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-22697, общей площадью 1270,1 кв. м;**
- **птичник № 10** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22700, общей площадью 1910,4 кв. м;**
- **птичник № 11** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22698, общей площадью 1311,6 кв. м;**
- **птичник № 15** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22699, общей площадью 1739,4 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек.**

